ДУА “Сярэдняя школа №1
г.Сянно імя З.І.Азгура”

# Рыхтуемся да алімпіяды

## (водгук)



## НАПІСАННЕ ВОДГУКУ

Патрабаванні да водгуку
1. Правільнае разуменне тэмы і ідэі прапанаванага твора.
2. Кампазіцыйная цэласнасць і завершанасць водгуку.
3. Інтэрпрэтацыя (тлумачэнне, раскрыццё сэнсу) асобных слоў, вобразаў, сімвалаў, тэмы і ідэі прапанаванага тэксту.
4. Сцісласць, канкрэтнасць і дакладнасць думак.
5. Уласнае стаўленне выяўленай тэмы і сістэмы моўных сродкаў.
6. Акуратнасць афармлення.

Найбольш распаўсюджаныя памылкі пры напісанні водгуку
1. Беспадстаўна вялікі аб'ём (ад 7 да 12 старонак) водгуку за кошт лішняй інфармацыі, не звязанай са зместам твора. Аптымальны аб'ём водгуку: 5–6 старонак.
2. Празмерная мастацкасць, "квяцістасць" стылю (дыялогі з кім-небудзь, вершаваная форма). Водгук – гэта не столькі мастацкі твор на зададзеную тэму, колькі індывідуальнае асэнсаванне таго, што і як сказаў аўтар, як вы гэта ўбачылі, зразумелі і здольныя інтэрпрэтаваць. Найбольшая колькасць балаў даецца за ўменне даць ацэнку прачытанаму, абгрунтаваць думку і за правільнае вызначэнне ролі сюжэта, кампазіцыі, мастацкіх вобразаў, моўных сродкаў у раскрыцці тэмы і ідэі твора.
3. Недакладнасць, двухсэнсоўнасць, нелагічнасць, арфаграфічныя, пунктуацыйныя, моўныя, стылёвыя памылкі.
4. Празмерна дакладны пераказ зместу твора з выкарыстаннем аўтарскіх метафар і эпітэтаў. Задача водгуку – не пераказаць тэкст, а расказаць пра яго, пра аўтара, пра падзеі, што згадваюцца, пра пачуцці, якія выкліканы зместам твора.
5. Адсутнасць у водгуках інфармацыі пра жанр і жанравую спецыфіку твора, параўнанняў з іншымі творамі прапанаванага аўтара, з тэматычна блізкімі творамі іншых пісьменнікаў.
6. Празмерная паэтычнасць, эмацыйнасць, пафаснасць мовы. Напрыклад: "Дзякуй нашай Радзіме за тое, што яна падаравала нам такіх майстроў. Я паставіла б Мар'яна Дуксу ў адзін рад з Купалам і Мележам. У мяне з'явілася адчуванне, што я знайшла адказ да вечнага пытання: "Што ёсць жыццё?" І за гэта я дзякую Мар'яну Дуксу".
7. Наяўнасць пэўнай цікавай формы (дыялог, ліст, урок, падарожжа і інш.) без яе належнай рэалізацыі, раскрыцця.



адносінаў да сваёй зямлі.
Такім чынам, верш У. Караткевіча "У векавечнай бацькаўшчыне клёны…" – яскравае сведчанне веры паэта ў векавечнасць, неўміручасць сваёй радзімы, яго запавет нам, нашчадкам, любіць і аберагаць прыгажосць сваёй бацькаўшчыны. А яшчэ гэты верш – доказ моцнай, неўміручай любові самаго паэта да сваёй цудоўнай "зямлі пад белымі крыламі".
…Спадзяюся, што мне ўдалося на прыкладзе верша "У векавечнай бацькаўшчыне клёны…" пераканаць Вас у тым, што паэзія У. Караткевіча сапраўды займае адну з вышэйшых прыступак на паэтычнай лесвіцы беларускай патрыятычнай лірыкі.

**Водгук вучаніцы 9 класа**
**ДУА "Сакалоўская сярэдняя школа".**
**Дадзеная творчая работа адзначана**
**дыпломам І ступені раённага конкурсу**
**водгукаў.**

гэта яркая прыкмета грамадзянскай лірыкі.
Такім чынам, наяўнасць у вершы адзнак трох відаў лірыкі ўказвае нам і на разнастайнасць праблем, якія ўздымае У. Караткевіч у творы: праблема захавання прыгажосці роднай зямлі, праблема сэнсу жыцця. Адсюль вынікае ідэя верша: наша жыццё на планеце вельмі хуткаплыннае, у параўнанні з векавечным існаваннем бацькаўшчыны, але менавіта ад нас залежыць гэтая векавечнасць. Любіць і берагчы сваю бацькаўшчыну – вось у чым заключаецца прызначэнне чалавека на зямлі.
У вершы вельмі выразна выяўляецца аўтарская пазіцыя. Аўтар не з'яўляецца староннім назіральнікам, а нібыта размаўляе са сваім чытачом-нашчадкам ("О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай…"), звяртаецца да Радзімы ("Адвечная мая!"). Гэтыя звароты сведчаць пра перажыванні не толькі лірычнага героя, але і самога аўтара. У іх чуецца пачуццё клопату, адказнасці за свае ўчынкі перад самім сабой і перад Бацькаўшчынай.
Як жа паэту ўдалося раскрыць сваю задуму, данесці да нас, чытачоў, ідэйна-тэматычны змест верша? Дапамаглі яму ў гэтым сродкі мастацкай выразнасці, якімі літаральна прасякнуты ўвесь твор. Так, эпітэт "векавечная" ў спалучэнні з назоўнікам "бацькаўшчына" перадае думку аб няспыннасці існавання роднага краю. Прыкметы восені паэт апісвае пры дапамозе эпітэтаў ("рыжая восень", "сцюдзёных росаў", "на рыжую траву", "на мох зялёны", "горкі смак рабіны"), метафар ("зямля глядзіць азёрамі-вачыма", зямля "раняе золата пад ногі людзям", "кліча лісцяў жоўты сум зіму"), параўнанняў ("як чыста, бы святло абшары вымыла", "як ціха – быццам зніклі людзі ўсе").
Важнае значэнне ў раскрыцці тэмы верша "У векавечнай бацькаўшчыне клёны…" мае кампазіцыя твора, падпарадкаваная найбольш поўнаму выражэнню ідэі. У вершы выразна вылучаюцца тры часткі: апісанне наступлення восені (уступ), звароты да Бацькаўшчыны і да нашчадкаў (асноўная частка), паўторнае апісанне восені з вывадам у апошнім радку. Кальцавая кампазіцыя верша дазволіла У. Караткевічу найбольш поўна і дакладна выразіць ідэю любові да Бацькаўшчыны і беражлівых адносінаў да сваёй зямлі.
Такім чынам, верш У. Караткевіча "У векавечнай бацькаўшчыне клёны…" – яскравае сведчанне веры паэта ў векавечнасць,



**Уладзімір Караткевіч**

***

У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы,
На ціхі стаў, на гаць.
Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха - быццам зніклі людзі ўсе.
Адвечная мая! Ў сцюдзёных росах,
Як летась, як мільёны год таму...
Ляцяць на ветры косы рыжай восені,
І кліча лісцяў жоўты сум зіму.
На вуснах стыне горкі смак рабіны,
Цалую іх, халодныя як лёд.
О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,
Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край, і далеч,
І жоўты ліст на зелені травы,
Што ў векавечнай бацькаўшчыне клёны
Тысячагоддзі будуць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць,
Што нездарма яна з асінак рудых,
Калі ідзеш увосень па зямлі,
Раняе золата пад ногі людзям,
Каб мы яе любілі й беераглі.

# "ВЕКАВЕЧНАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА"
# (водгук на верш У. Караткевіча)

Бацькаўшчына… Радзіма… Айчына… Мы часта чуем гэтыя словы, ужываем іх у сваім маўленні. Мы імкнемся зразумець значэнне гэтых слоў. Мы спрабуем вызначыць свае адносіны да Бацькаўшчыны, перадаць сваю любоў да Радзімы… Хтосьці робіць карысныя справы для Бацькаўшчыны, хтосьці перадае свае пачуцці пры дапамозе фарбаў, музыкі… А паэты выказваюць свае адносіны да Радзімы, карыстаючыся словам. Напэўна, цяжка знайсці ў беларускай літаратуры паэта, які б не пісаў пра Бацькаўшчыну. Можна прыгадаць імёны Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, А. Куляшова, П. Панчанкі, Р. Барадуліна… Аднак, мне здаецца, сярод усіх паэтаў, якія прысвячалі свае творы тэме Радзімы, імя У. Караткевіча, васьмідзесяцігоддзе з дня нараджэння якога мы адзначаем у гэтым годзе, выдзяляецца і займае, напэўна, адну з вышэйшых прыступак на паэтычнай лесвіцы патрыятычнай лірыкі. Чаму я так лічу? Таму што ўсё сваё жыццё паэт прысвяціў служэнню Радзіме, вывучэнню гісторыі свайго краю, мастацкаму адлюстраванню беларускай гісторыі ў прозе (раман "Каласы пад сярпом тваім", аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшанскі" і інш.), драматургіі (п'есы "Званы Віцебска", "Кастусь Каліноўскі"), публіцыстыцы (нарыс "Зямля пад белымі крыламі"), кінематографе (сцэнарыі фільмаў "Сведкі вечнасці", "Памяць каменя"). Усё, пра што б ні пісаў У. Караткевіч, прасякнута любоўю да сваёй краіны, яе гісторыі. Лірыка паэта (зборнікі "Матчына душа", "Мая Іліяда", "Быў. Ёсць. Буду") найбольш ярка гэта адлюстроўвае. Не верыце мне? Давайце разам пераканаемся на прыкладзе цудоўнага верша "У векавечнай бацькаўшчыне клёны…".

Першае ўражанне пасля знаёмства з вершам – пачуццё поўнага спакою на душы. Спакой ідзе, напэўна, ад разумення вечнасці, трываласці той прыгажосці, якая вакол нас:

Адвечная мая! Ў сцюдзёных росах,
Як летась, як мільёны год таму…

Аднак перачытваючы верш, пачынаю разумець, што разам са спакоем у сэрцы з'яўляецца пачуццё захаплення. Магчыма, яно ўзнікае пад уражаннем вось гэтых радкоў:



Аднак перачытваючы верш, пачынаю разумець, што разам са спакоем у сэрцы з'яўляецца пачуццё захаплення. Магчыма, яно ўзнікае пад уражаннем вось гэтых радкоў:

Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха – быццам зніклі людзі ўсе.

Гэтая цішыня нагадвае радкі з вядомага верша А. Грачанікава "Дрымотна цiснуцца кусты…":

Дрымотна цiснуцца кусты
Пад цёплы бок дубровы цiхай.
І ў цішыні за тры вярсты
Чуваць, як п'е ваду ласіха.

Першыя ўражанні паступова прыводзяць да высновы аб тэматычнай прыналежнасці верша "У векавечнай бацькаўшчыне клёны…" да тэмы Радзімы. Раскрывае гэтую тэму У. Караткевіч у трох накірунках, якія ўказваюць на адзнакі ў вершы прыкмет адразу трох відаў лірыкі: пейзажнай, філасофскай і грамадзянскай.

Па-першае, апісанне прыгажосці восеньскай прыроды:

У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы,
На ціхі стаў, на гаць.

Па-другое, у вершы гучыць філасофская думка паэта пра хуткаплыннасць чалавечага жыцця на зямлі, у параўнанні з векавечнасцю жыцця прыроды, існавання роднай зямлі. Аб гэтым сведчыць зварот лірычнага героя да нашчадкаў, да будучых пакаленняў:

О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,
Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край, і далеч,
І жоўты ліст на зелені травы…

Па-трэцяе, заклік у канцы вершы любіць і берагчы сваю зямлю – гэта яркая прыкмета грамадзянскай лірыкі.

Такім чынам, наяўнасць у вершы адзнак трох відаў лірыкі ўказвае нам і на разнастайнасць праблем, якія ўздымае У. Караткевіч у